**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2024 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

***1 снежня***

*Адзначыць Дзень на гадзіне праблемнай гутаркі «СНІД – без міфаў і ілюзій» запрошаны навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. На мерапрыемстве выступілі ўрач па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ* ***Васільева Святлана*** *і ігумен Свята-Хрыстанараджэнскай царквы* ***айцец Андрэй****.*

*Установа, 57 чал.*

**1 снежня**

*Бібліятэкар расказала пра вірус імунадэфіцыту чалавека выхаванцам дзіцячага дома на ўроке здароўя «Не нужно бояться, нужно знать».*

*Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 21 чал.*

***1 снежня***

*Падчас пазнавальнай гадзіны «СНІД: ёсць пра што падумаць» бібліятэкар расказала навучэнцам старэйшых класаў аб праблемах СНІДу і прапанавала тэматычныя інфармацыйныя буклеты.*

*Філіял «Лукская сельская бібліятэка», 17 чал.*

## Мерапрыемствы да Года якасці

***2 снежня***

*У чытальнай зале адбылася творчая сустрэча з лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі, пераможцай шэрагу абласных, рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Зінаідай Дудзюк..*

*Установа, 37 чал.*

***4 снежня***

*Гадзіну цікавых паведамленняў «Брэстчына: людзі, падзеі, факты», прымеркаваную да 85-годдзя ўтварэння Брэсцкай вобласці, наведалі ў чытальнай зале падапечныя аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН.*

*Установа, 25 чал.*

***6 снежня***

*Аб незвычайнай і важнай справе, звязанай з арганізацыяй інфармацыі і культурных скарбаў змаглі даведацца навучэнцы СШ № 7 на інфармацыйна-адукацыйнай гадзіне «Зову в свою профессию: о профессии библиотекаря».*

*Установа, 22 чал.*

***13 снежня***

*У чытальнай зале бібліятэкі прайшоў Дзень прафесійнага камунікавання «Библиотечное обслуживание: динамика изменений, поиск нового», удзельнікамі якога сталі бібліятэкары горада і раёна. Падведзены вынікі раённага конкурсу на лепшую пастаноўку работы з дзецьмі і падлеткамі ў канікулярны час у рамках сацыякультурнага праекта «Объединить, заинтересовать, увлечь». Пераможцам конкурсу стала Гарадзецкая сельская бібліятэка (бібліятэкар – Барысевіч Т. Л.).*

Установа, 27 чал.

***20 снежня***

*Студэнты Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа прынялі ўдзел у інфармацыйна-адукацыйнай гадзіне «Страна, Народ, Президент: 30 лет Президентской власти», прысвечанай трыццатай гадавіне абрання Аляксандра Лукашэнка першым Прэзідэнтам Беларусі і станаўленні Прэзідэнцкай Рэспублікі.*

*Установа, 53 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

***4 снежня***

*Спецыяліст па сацыяльнай рабоце Алена Асіюк і удзельнікі мастацкай самадзейнасці Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «БелТІЗ» выступілі на літаратурна-музычнай кампазіцыі «С верой и надеждой», якая прайшла ў рамках праекта «От милосердия в книгах-к неравнодушию к жизни» для інвалідаў аграгарадка.*

*Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 32 чал.*

***6 снежня***

*У рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва» Ірынай Пятроўнай Марчук і Наталляй Мікалаеўнай Марчук праведзена бясплатнае індывідуальнае кансультаванне грамадзян па натарыяльных пытаннях. У мерапрыемстве прыняў удзел стажор С. С. Аміран.*

*Установа, 16 чал.*

***12 снежня***

*Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў гімназіі з біяграфіямі людзей з абмежаванымі магчымасцямі падчас гадзіны дабрыні «И невозможное – возможно!».*

*Установа, 30 чал.*

***17 снежня***

*Адбыліся пятыя духоўна-асветніцкія чытанні «Каждое сердце должно быть маленьким садом», у якіх прынялі ўдзел настаяцель храма святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла протаіерэй Аляксандр Канцэвіч, старшыня Залескага сельвыканкама - Святлана Власюк, дырэктар Залескай СШ - Аляксандр Алейнік, рэгент храма - Ганна Кабрынец.*

*Філіял «Залеская сельская бібліятэка», 62 чал.*

## Выдавецкая дзейнасць

*Адзелам абслугоўвання і інфармацыі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» сфарміраваны* ***краязнаўчы паўнатэкставы інфармацыйны рэсурс «Тэрыторыя высокага густу: Кобрынскі масларобна-сыраробны завод»****.*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81